Прывітальнае слова
рэктара Мінскай духоўнай акадэміі
да ўдзельнікаў навукова-практычнай канферэнцыі
«Докшыцкі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна»
(Докшыцы, 11 чэрвеня 2026 года)

Паважаныя арганізатары і ўдзельнікі канферэнцыі!
Шаноўнае спадарства! Дарагія браты і сёстры ў Хрысце!

Ад імя прафесарска-выкладчыцкай карпарацыі, супрацоўнікаў і навучэнцаў Мінскай духоўнай акадэміі імя свяціцеля Кірыла Тураўскага Беларускай Праваслаўнай Царквы сардэчна вітаю ўсіх з адкрыццём навуковага форуму ў Докшыцах!

Першая чвэрць XXI стагоддзя хрысціянскай эры характарызуецца значнай увагай і павагай нашага грамадства да рэгіянальных навукова-краязнаўчых даследаванняў. Практычна ў кожным раёне Беларусі ёсць уласныя распрацоўкі, праходзяць сустрэчы, чытанні і канферэнцыі, выдаюцца даведнікі і краязнаўчыя нарысы, створаны электронныя рэсурсы. Удзел прадстаўнікоў навуковай супольнасці надае мясцовым досведам, нярэдка школьнага ці аматарскага ўзроўню, новае гучанне і даследчыцкую глыбіню.

Гісторыка-краязнаўчая тэматыка традыцыйна знадзіцца ў полі зроку выкладчыкаў і студэнтаў духоўных навучальных устаноў Беларускай Праваслаўнай Царквы. Мінская духоўная акадэмія, Мінская і Віцебская духоўныя семінарыі, іншыя епархіяльныя цэнтры адукацыі маюць што прапанаваць з распрацовак па канфесійнай гісторыі нашай Бацькаўшчыны. За 37 гадоў з моманту адраджэння дзейнасці рэлігійна-асветніцкіх асяродкаў на Беларусі лік выкананых даследчыцкіх прац ідзе ужо на сотні. Нас радуе, што здабыткі беларускай царкоўна-гістарычнай навукі не пазбаўлены ўвагі з боку прафесійных гісторыкаў і дасведчаных краязнаўцаў. Яскравым пацвярджэннем такому падыходу можа служыць наша канферэнцыя.

Сёння хочацца нагадаць слаўныя імёны некаторых выдатных вучоных і святароў – нашых бліжэйшых папярэднікаў. У «залатым фондзе» Докшыцкага краю – протапрэсвітар Рускай Праваслаўнай Царквы прафесар айцец Віталій Баравой, заслужаны прафесар Маскоўскай духоўнай акадэміі і ганаровы сябра Мінскай духоўнай акадэміі Канстанцін Яфімавіч Скурат, магістр праваслаўнай тэалогіі Варшаўскага ўніверсітэта, інспектар Віленскай духоўнай семінарыі айцец Міхаіл Кузменка. Для іх Несцераўка, Камайск і Порплішча

Докшыцкага краю – не проста геаграфічныя пункты, а калыскі натхнення, любові і духоўнага развіцця. Адсюль, з гэтай зямлі, пачаўся іх шлях у шырокі свет, да вышынь навуковых дасягненняў і міжнароднага прызнання. Моцны і натхнёны голас айца Віталія Баравога, напрыклад, гучаў з самых высокіх трыбун у Іерусаліме і Рыме, Жэневе і Берліне, Парыжы і Маскве. Але для яго назаўсёды родная Докшыччына была люстэркам мілай сэрцу і Богам беражонай Беларусі.

Жадаю ўсім удзельнікам канферэнцыі і гасцінным жыхарам Докшыцкага краю цікавых і змястоўных абмеркаванняў праграмы канференцыі, новых поглядаў і падыходаў да пытанняў краязнаўства, папулярызацыі ўласнай і адметнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Няхай высокія прыклады самаадданага служэння роднаму краю, нашым сучаснікам, найперш моладзі і дзецям, якім мы перадаём захаваныя скарбы вякоў, заўсёды натхняюць ўсіх нас і прыносяць добры плён!

З павагаю, архімандрыт Афанасій (Сакалоў), рэктар Мінскай духоўнай акадэміі

11 чэрвеня 2026 г.
Мінск – Докшыцы.